***Т. Ф. Сухоцкая,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт*

# ТРАГЕДЫЙНЫ ПАФАС ЭКСПРЭСІЯНІЗМУ

Абвостранае выражэнне трагедыйнасці сучаснай сацыякультурнай сітуацыі, напружаных узаемаадносін чалавека і грамадства робіць экспрэсіяніснкія прыёмы эмацыйнага ўздзеяння на асобу запатрабаванымі сучасным мастацтвам, што пацвярджае яго полістылёвасць, поліфанічнасць.

«Згубленае пакаленне» Э. М. Рэмарка, Э. Хэмінгуэя, Р. Олдынгтана, С. Ф. Фіцджэральда не разумела сэнсу крывавай бойні Першай сусветнай вайны. Уласны трагічны вопыт, адчуванне сваёй нікчэмнасці і незапатрабаванасці ў пасляваенным жыцці вялі да сумневу ў інтэлектуальных магчымасцях і маральных якасцях людзей, якія дзеля нажывы развязалі масавыя забойствы. Размывалася перспектыва будучага развіцця грамадства. Трагічны дух эпохі мастацтва ўвасабляла рознымі шляхамі. Эфектыўным сродкам выражэння стаў экспрэсіянісцкі падыход, які атрымаў найбольшае развіццё ў пераможанай, прыгнечанай галечай Германіі, дзе сацыякультурныя рэаліі фарміравалі новы тып гістарычнага суб'екта – сацыяльна актыўнага, пазбаўленага любой маральнай рэфлексіі «зверхчалавека». У створаны Гітлерам і яго паплечнікамі «вобраз ворага» ўваходзілі інтэлігент, яўрэй, камуніст і мастак-экспрэсіяніст. У 1936 годзе ў Берліне была арганізавана вялікая выстава пад назвай «Дэгенератыўнае мастацтва: выстава «культурных дакументаў» бальшавіцкай і яўрэйскай дэкадэнцкай работы». Яе наведалі Гітлер і Гебельс і далі адпаведныя здзеклівыя ацэнкі экспанатам.

Экспрэсіянізм стаў адным з першых авангардных цячэнняў у мастацтве XX стагоддзя, якое канстатавала агульнакультурны і гуманістычна-экзістэнцыялісцкі крызіс. Лічыцца, што сам тэрмін «экспрэсіянізм» быў уведзены чэшскім гісторыкам мастацтваў Антоніем Матэйчэкам у 1910 г. у супрацьлегласць тэрміну «імпрэсіянізм». Аб'яднанне нямецкіх мастакоў у 1905 г. у групу «Мост» засведчыла канчатковае афармленне азначанага кірунку. Са зменай пазітывісцкай, сціентысцкай парадыгмы на антрапалагічную ўвага мысліцеляў пераключаецца са «знешняга» прадмета, сацыяльна-прыроднага, на «ўнутраны», асобасна-чалавечы. Філасофскім падмуркам экспэсіянізму сталі, най-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перш, ідэі Ф. Ніцшэ, С. К'еркегора, фенаменалогіі Э. Гусэрля, інтуітывізм А. Бергсана і псіхааналітычнае вучэнне З. Фрэйда. Экспрэсіяністкае светаадчуванне арыентуецца на сцвярджэнне ідэі самакаштоўнасці чалавечай асобы, яе свабоды, адраджэнне сапраўднай прыроднасці ў чалавеку, «першасных інстынктаў жыцця» [1, с. 370].

Жыццядзейнасць экспрэсіянізму пацвярджаецца яго запатрабаванасцю рознымі відамі мастацкай культуры: скульптурай (Э. Барлах, В. Лембрук); кіно (Р. Віне, Ф. Мурнаў); літаратурай (А. Рэмбо, А. Стрындберг, Р. Рыльке, Л. Франка і Ф. Кафка); музыкай (І. Стравінскі, Б. Барток, А. Берг і інш.). Экспрэсіяністкай эстэтыкай пазначаны і культурныя тэксты папярэдніх эпох, напрыклад, творы Э. Босха, Э. Грэка і інш.

Экспрэсіянізм арыентуецца на суб'ектыўны, часта ірацыянальны, містычны досвед мастака. Адметнымі становяцца адмова ад гармоніі, раўнавагі, духоўнай і разумовай выразнасці. Трагічна абсурдная, катастрафічная культурная прастора, якая выклікае жах у чалавека, ствараецца праз дэфармацыю прадметнасці акаляючай рэчаіснасці, абвостраны дынамізм, экзальтаваныя станы чалавека, гульню светлавых кантрастаў. Выяўленне памежных эмацыйных станаў непрыняцця быцця выклікае гаму моцных адмоўных пачуццяў.

Семантыка экспрэсіянізму абумоўлена прызнаннем у чалавека сферы несвядомага. З пазіцый Ф. Ніцшэ несвядомае асацыіруецца з дыянісцкім пачаткам у культуры, але ў экспрэсіянісцкіх тэкстах дыянісцкая энергетыка эмацыйна прытупляецца. Яна не скіравана на актывізацыю сацыяльнага дзеяння суб'екта, выяўленне яго вітальных магчымасцей. Экзістэнцыяльны жах, пранізлівы і панічны, выяўлены на карціне Э. Мунка «Крык». Прароцтвы мастака пра дзве сусветныя вайны ў XX стагоддзі, халакост, экалагічныя катастрофы і ядзерную зброю прасякнуты інтанацыяй трагічнага абсурду, паралізуюць патэнцыяльныя здольнасці асобы. У творах Ф. Кафкі трагедыйнасць чалавечага існавання разбурае суб'екта, падаўляе праяўленне цягі да жыцця.

Неабходна адзначыць, што экспрэсіянізм паўплываў на стварэнне многіх культурных феноменаў масавай культуры ў XX стагоддзі. Стваральнік знакамітай маскі У. Крэйвен у фільме «Крык» быў натхнёны менавіта шэдэўрам нарвежскага мастака. Экспрэсіяністкая паэтыка выразна выявілася ў такім



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кірунку кінематографа, як фільмы жахаў. Катарсічны эфект тут падмяняецца татальным насаджэннем жаху праз стварэнне выразных ірацыянальных і містычных вобразаў хранатопу паралельнай рэальнасці. Адбываецца разрыў суб'екта са сферай розуму, глядач як бы «паглынаецца». У 1940–50-я гг. экспрэсіянізм трансфармуецца ў абстрактны экспрэсіянізм.

У беларускай культуры пачатку ХХ ст. праявілася здольнасць узаемадзеяння розных стылёвых кірункаў. Назіраецца перапляценне і кантамінацыя сімвалізму, імпрэсіянізму, мадэрнізму, рэалізму, экспрэсіянізму. Экспрэсіўнай сімволікай, якая стварае трагічную сутнасць рэалій беларускай сітуацыі пачатку ХХ ст., прасякнута паэма Янкі Купалы «Сон на кургане». Курган, шынок, замерзлая жанчына, жанчына-вар'ятка, сляпая – трагічныя сімвалы беларускай гісторыі. На прыкладзе галоўнага героя Сама паказваецца асабістая драма адраджэнцаў, адасобленых ад мас сцяною непаразумення, пазбаўленых падтрымкі аднадумцаў і паплечнікаў. Выйсце ў Купалы – зварот да Радзімы, да Беларусі. Паэма актывізуе сацыяльную актыўнасць асобы і сцвярджае неабходнасць самім пракладваць свой шлях.

Веліч, моц выяў скульптурных работ А. Грубэ «Раб», «Тачачнік», «Праца» ўражваюць манументальнасцю, велічнасцю сімвалаў-вобразаў, ствараюць экспрэсіўнае напружанне. Такім чынам, у беларускім мастацтве шлях да сімвалічных абагульненняў ляжаў найперш праз экспрэсіянізм, які не паралізуе дух суб'екта, а з'яўляецца магутным сродкам мабілізацыі і актывізацыі дзейснага патэнцыялу.

Экспрэсіянісцкая эстэтыка запатрабавана беларускім мастацтвам для выяўлення абсурду чарнобыльскай катастрофы. Гэта, найперш, творы М. Савіцкага, яго знакаміты цыкл карцін «Чорная быль». Эмацыйнае напружанне, адчуванне «незвароту» ствараецца праз напаўненне трагедыйнай семантыкай традыцыйных сімвалаў і сюжэтаў: крыж, анёл, нараджэнне дзіцяці, калыханка і г.д.

Такім чынам, актуалізацыя экспрэсіянісцкай эстэтыкі ў сучаснай культуры абумоўлена абвастрэннем супрацьстаяння чалавека і жорсткага соцыуму, скіравана супраць ператварэння асобы ў знак сацыяльнай функцыі.

*Бычков, В. В.* Эстетика / В.В. Бычков. – М. : Гардарики, 2004. – 556 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ